**АСАТКІН-УЛАДЗІМІРСКІ** Аляксандр Мікалаевіч [3(15).10.1885, с. Вазнясенскае Кастрамскога пав.— вер. 1937], савецкі парт. і дзярж. дзеяч. Скончыў Маскоўскі камерцыйны ін-т. Член КПСС з 1904. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07. Працаваў у Кастрамской, Іванава-Вазнясенскай, Уладзімірскай арг-цыях РСДРП. За рэв. дзейнасць 6 разоў зняволены, 2 разы сасланы. У 1918—21 чл. Прэзідыума ВЦСПС, чл. ЦК прафсаюза тэкстыльшчыкаў. У 1921 у Туркестанскай АССР: нарком гасп. спраў, нам. старшыні СНК, старшыня эканам. Савета. З 1922 адказны інструктар ЦК РКП(б). У маі 1923 узначаліў партыйна-ўрадавую камісію па ўзбуйненні БССР. З 4.2.1924 сакратар *Часовага Беларускага бюро ЦК РКП(б)*. У маі—вер. 1924 першы сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б. Затым у апараце ЦК ВКП(б). З 1925 адказны сакратар Уладзімірскага губкома партыі, чл. Рэвізійнай камісіі ЦК ВКП(б). У 1928—29 старшыня праўлення Усесаюзнага с.-г. банка. З 1930 у Хабараўску, старшыня выканкома Далёкаўсходняга краю. У 1931—32 прадстаўнік Наркамата знешняга гандлю СССР у Японіі і Кітаі. У 1933—35 нач. палітсектара МТС Наркамзема УССР, чл. Аргбюро ЦК КП Украіны, чл. ЦК ВКП(б). З 1935 нач. Упраўлення нар.-гасп. ўліку УССР. З ліст. 1936 чл. Прэзідыума Акадэміі навук УССР, дырэктар Ін-та эканомікі АН УССР. У 1937 незаконна рэпрэсіраваны і пакараны смерцю. Рэабілітаваны ў 1957.



А. М. Асаткін-Уладзімірскі.